**Сяргей Законнікаў**

# Шалёная куля

*(паэзія пяці гадоў)*

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2010

УДК 821.161.3-1
БЕК 84(4Беи)-5

Законнікаў, С.

Шалёная куля : вершы пяці гадоў / Сяргей Законнікаў. — Мінск: Зміцер Колас, 2010.— 104 с.

ISBN 978-985-6783-99-2

Новая кніга Сяргея Законнікава «Шалёная Куля» перадае пачуцці чалавека, які жыве ў дынамічным і трывожным XXI стагоддзі. Аўтар абвострана адчувае еднасць не толькі з роднай Беларуссю, са сваім народам, чыёй будучыняй шчыра, па-сыноўску заклапочаны, але і з вялікім светам.
Усё, што закранае яго сэрца дома і ў вандроўках па планеце, прыходзіць у паэзію. Адрасуецца шырокай чытацкай аўдыторыі.

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Бей)-5

ISBN 978-985-6783-99-2

©Законнікаў С. І., 2010.

**Мне свет цікавы**

Цячэ рака,
Зіхцяць у росах травы -
Мне гэты белы свет яшчэ цікавы.
Я ў ім пакуль дашчэнту не зажыўся,
Хоць на планеце ўволю накружыўся.
У звыклых месцах і за акіянам
Хапае між людзьмі дасюль падману.
Але мяне не падмане ніколі
Святое хараство зямное волі.
Душа мая без стомы з ёю ў змове,
Каб занатоўваць тайну ў родным слове...
Мне гэты белы свет яшчэ цікавы,
Хоць ведаю,
Дзе левы бок,
Дзе - правы.

**«Давай палятаем!»**

Прыладзіў яе ні высока, ні нізка
Мой дзед у вайною нязнішчаным садзе.
На промнях нябесных павісла калыска,
На крэўнай любові, якая не здрадзіць.
Вяртаюцца сном даўняй явы хвіліны,
Дзе квецень густая над сонцам зіхцела,
Дзе гладзіў я кволай далонькай сівіны,
Імкнуўся ў нязнанасць даверліва, смела.
А дзед барадою казыча мне шчокі,
У вочы глядзіць - дзень наступны вітае,
Калыску разгойдвае шчодрай пяшчотай:
«Ну што, мой саколік, давай палятаем!»
І я паляцеў пуцявінаю долі,
Дзе радасць і гора зацята мяжуюць.
Цяпер на яе з вышыні неспатолі
Гляджу са здзіўленнем, нібы па чужую.
Душа, закранутая рухам касмічным,
Адчайна трымціць, як у першым палёце.
Жыццё, што здавалася вечным і звычным,
Гучыць на высокай, абрывістай ноце.
Яно ломіць крылы, як вольная птушка,
І толькі любоў мне адвагу вяртае...
Унука Францішка я ўзняў,
Каб пагушкаць:
«Ну што, мой саколік?
Давай палятаем!»

* * *

Ёсць раўнавага ў спрадвечнай прыродзе,
Рэдка калі надараецца збой.
Існае з круга быццямы не выходзіць,
Кожны трымаецца нішы сваёй.

А чалавек на такое не згодны,
Прагне надбаўкі настойліва ён:
Ехаць жадае ў купэ міжнародным,
Хоць заплаціў за агульны вагон.

* * *

Пабольшаў дзень на вераб'іны крок...
А вось і ён валтузіцца пад бэзам:
То «чык-чырык»,
То раптам скок-паскок -
Вясну вітае радасны гарэза.

Папіў вады з праталін і замёр,
Цікуе круглым хітраватым вокам.
Яму няўцям, што ёсць людскі дакор,
Што клічуць недарэчным абібокам.

А той, хто аўтар велічнай гульні,
Да жэўжыка прэтэнзіі не мае
І лічыць роўным між усёй радні,
Якая на быццё іспыт трымае.

Адчуў сваім няўтомніка і я,
Каўтаю побач пасвяжэлы вецер.
Мне даспадобы стойкасць вераб'я,
Яго прысутнасць у няпростым свеце.

**Еду з кірмашу**

*Памяці Уладзіміра Караткевіча*

Я еду з кірмашу.
На ім было
Завозна хмелем,
Ласкай незабыўнае
Памалу сэрца хакаць пачало,
Як вёрстамі загнаная кабылка.

Там,
Дзе ўладараць продаж і гульба,
Я толькі на хвілінку паказаўся.
На кірмашы нічога не прыдбаў
І прапаноўваць нешта не збіраўся.

Няма ў мяне тавару.
Есць душа,
Але яна - запас недатыкальны.
І да таго ж нявартa ні гранкі
У свеце,
Дзе гандлююць маньякальна.

Міргаюць скрозь прывабныя агні,
А я адводжу вочы нелюдзіма,
Хоць гаварыў:
«Карчмы не праміні!»
Мой неўміручы сябра Уладзімір.
Як ён,
Пачуццям давяраў найперш,
Таму і зараз
прадчуванню веру,
Бо пішацца ў душы астатні верш -
Вагомей тых,
Што леглі па паперу.
Я еду з кірмашу
На той парог,
Дзе задаюць няпростыя пытанні...
Мацней віна мяне збівае з ног
Касмічны сум
Апошняга расстання.

**Аркестр**

Бязладнай музыкі акорды
Душу прабілі навылёт...
Неапахмелена, няцвёрда
Брыдзе аркестр,
За ім - народ.
Дзяўбуць расхрыстаныя гукі,
Як груганы,
Прыціхлы свет.
І страшна ад такой прынукі
Глядзець няшчаднай смерці ўслед.
Праходзіць кожны шлях да краю,
Дзе знерухомела бяда...
Ды так аркестр фальшыва грае,
Што мне ўвесь род людскі шкада.

* * *

Жыццё - не карнавал,
А ўсё-ткі драма,
І выстаўляць прэтэнзіі дарма.
За ім, як за настырнаю рэкламай,
Паабяцанай якасці няма.

**Занятак**

Шлях чалавецтва ў нетрах часу
Віхляецца ва ўсе бакі.
Яго рабілі пакручастым
І ўладары,
І жабракі.
Але найболей вінаваты
У тым,
Што долю гвалціць здзек,
Што праўду валакуць за краты, -
Звычайны, просты чалавек.
Ах, гэты чалавек маленькі -
Спрадвечны вораг сам сабе.
Заўжды ў яго дрыжаць каленькі,
Як быццам хлеб не свой дзяўбе.
Хоць шмат разоў ён пакараны
За цёмны, непрыстойны страх,
І ўсё ж гадуе зноў тыранаў
На ўласным поце і касцях.
Спіць сіла ў глыбіні мільёнаў,
А кожны паасобку - гном:
Цалуе боты,
Б'е паклоны
Тым,
Хто махае бізуном.
Не замарыўся час пракляты
Літаўрамі хлусні грымець.
Лягчэй вяртацца ў рабскі статак,
Чым волю па вякі займець.
Вось і жыве занятак сталы,
Якому скону не відаць, -
Рабіць для монстраў п'едэсталы,
А потым іх адтуль скідаць...
Скідаць... і новых узнімаць.

**Скляпенне віны**

У тым, што страхам край заліты,
Ёсць частка і маёй віны.
Прыходзяць вершы, як малітвы,
Але бяссільныя яны.
Радок балючы кроў успеніць,
Ён здольны верыць і любіць...
І ўсё ж вісіць віны скляпенне,
Якое словам не прабіць.

**Адыходзіць эпоха**

*Генадзю Дзмітрыеву*

Адыходзіць эпоха...
Дзвярыма не бразне...
Уцякае ад ганьбы,
Ды, маючы нюх,
Зноў на сцэну вылазяць
Тыраны і блазны,
Ставяць той жа спектакль.
Паўтараецца круг.
Зноў гульня,
А жыццё адпіхнута на потым,
Зноў салюты грымяць
І растуць міражы.
Як тады,
Несуцешна рыдаюць сіроты,
Як тады,
Праўда б'ецца
На змрочным крыжы...
О, эпоха!
А з грэцкае мовы - прыпынак.
Вось і я супыняюся ў скрусе нямой,
Углядаюся ў люд,
У сагнутыя спіны...
Гэты свет - быццам звыклы,
Але ўжо не мой.
Нехта пальцам слінявым
Паспешліва лісціць
Каляндар,
І лісткі безнадзейна трымцяць.
Я, відаць, сапраўды старамодны і лішні,
Ды куды мне падзець
Свой акрайчык жыцця?
Не ўратуе і тое, што лечыць заўсёды:
Бор грыбны,
Луг
І хваляў азёрных прыбой...
Адыходзіць эпоха...
Нахабна, без згоды
Нас - жывых - валачэ,
Забірае з сабой.

## На аўтобусным прыпынку

Бабулькі аглядаюць свет сур'ёзна,
Бягуць асталявацца, як ямчэй.
Хаваюць ногі ў венах варыкозных
Пад лаўку - далей ад чужых вачэй.
Стаяць скульптурна, годна маладзіцы,
Як выклік неўтаймоўнае красы.
А побач звонка цінькаюць сініцы -
Чуваць дзяўчатак мілых галасы.
Яны ў сваю чароўнасць млосна верацць,
Ім радасна пляткарыць, шчабятаць.
Прысуд наўзмаш выносяць кавалеру:
«Такі стары, яму ўжо дваццаць пяць!»
Ласкава сонца сагрэе сівіны,
Прыгожа глыбіць вочы-васількі,
Усмешліва, з пяшчотаю няспыннай
Цалуе яблык юнае шчакі.
І я, ва ўсіх адразу закаханы,
Знаходжу сказ да месца нездарма:
«Усё на свеце будзе занядбана,
А для жанчын мінулага няма!»

**Белая сукеначка**

Белая сукеначка мільгнула
На начной сцяжыне ўскрай сяла
І мілосцю вольнай ахінула
Сэрца неспакойнае:
«Прыйшла...»
Быў пасля і гордым, і паніклым,
Быў бядой раструшчаным амаль.
Белая сукеначка не знікла
Ветразем паміж будзённых хваль.
Хутка цела цёмнай глебай стане,
А душа рванецца на святло.
Што было?
Адзінае - каханне,
Рэшта - сумятня і мараў тло.
Адпакутаваўся, адкружыўся
Па чужых і па сваіх слядах.
У ажыннай квецені сцяжынка
Выведзе мяне па Млечны Шлях.
Позіркам расстайным аббягаю
Свет,
Што адплывае ў забыццё...
Белая сукеначка ля гаю
Прамільгнула,
Як маё жыццё.

**Цяжэй**

Злянелы ад шчадрот прагрэсу,
Атручаны не меней ім,
Я выглядаю, як давесак
Да сумятлівых лет і зім.
Хоць дух мой
Стоме не скарыўся,
Салоўкі чую спеў: «Цёх-цёх...»
Ды ўсё цяжэй знаходзіць рыфмы
Да слова ёмкага -
Жыццё.

**Я хворы табой..**

Плыве паабапал дарогі па Вільню
Прастор,
Каб трывожыць ва ўпор і здаля...
Я хворы табой,
І ўрачы тут бяссільны,
Мая непрыкметная ў свеце
Зямля.
А доля між родных палёў дасталася
Такая.,
Што кругам ідзе галава.
Дасюль не сабрана радня да стала ўся,
Хоць Крывія кліча,
Гукае Літва.
Па карку дубінкай гумоваю - «Kresy»,
А пелькаю - «Северо-Западный край»...
Цябе,
Прыхаванай хлуслівай завесай,
Мне суджана несці
Ці ў пекла, ці ў рай...
Бялеюць снягі і зара чырванее,
Зліваюцца ў велічны, радасны сцяг.
Акрыцца ім хочацца з вечнай надзеяй,
Што будзе ў цябе
Неўміручы працяг.
Мая Беларусь!
Непадзельнай любоўю
Забі,
Толькі выцісні рабства з крыві.
Адпрэч і чарнобыльскае белакроўе...
Жыві!

**Глядзець у неба**

У цеснай і няўтульнай дамавіне
Свабодны дух ніколі не загіне.
Над шэрай глебай,
Над нудой і горам
Ляціць душа да вольных, светлых зорак.
Бясконцы далягляд ад чалавека
Не засціць і труны халоднай века.
І тут,
І там несупакойным людзям
Ратункам толькі спадзяванне будзе...
Любоўю да зямлі сваёй прыкутым
Заўсёды жыць мілосна і пакутна.
Ды ёсць яшчэ астатняя патрэба...
Мы паміраем,
Каб глядзець у неба.

**Усё было…**

Усё было…
І нудны дождж,
І груганоў крыжы ў нябёсах…
Глядзі,
Наперад лёс свой доўж,
Хоць ты галодны,
Голы,
Босы.
Шчаслівы дар -
Цярновы шлях -
Заўжды вядзе праз боль і страты.
А ў тым,
Што душы душыць страх,
Тварэц жыцця не вінаваты.
Віну не ўтопіш у віне,
Маной ад праўды не прыкрыцца.
Пры мне,
А потым без мяне
Усё міне,
Каб паўтарыцца…

## Умова

Памерлых дзён ірвуцца струны
Пад пальцамі жывога лёсу.
Ляцяць у вечнасць вершаў руны,
Дзе шмат чаго па пыл звялося.
Але не дзеля славы весняй
Ці ўдзячнай памяці нашчадкаў
Зноў чарнавік душы я крэслю,
Кідаю забыццю пальчатку.
У царства смерці з горняй кручы
Спускаюся з адной умовай -
Каб мой народ быў неўміручым,
Каб вольна дыхаў родным словам!

**Мацней даражу**

Нікому жыццё паўтарыць немагчыма,
Даецца ашчадна і шчодра - адно.
І як бы зязюлька яго ні лічыла,
А фініш бязлітасны мае яно.
То з выраю,
То за далёкае мора
Ганцамі свабоды ляцяць жураўлі.
Дні радасці,
Дні непазбыўнага гора
Стагуюцца так
Як прыйшлі- адышлі.
Не выкінеш і не закрэсліш ніводны,
Надзеяй узяты ў спакусны палон...
І сам непрыкметна на ўсё станеш згодным,
Прымаючы вечнай прыроды закон.
Ды ўсё-ткі насуперак долі зласлівай
Аблічча тваё прасвятляе імжу...
Наколькі мой час карацее імклiва -
Настолькі каханнем мацней даражу.

**Пальчык**

Прыклала свой пальчык да вуснаў:
«Маўчы...»,
Вяла па прыступках мілосці ў нябёсы...
Мне помніцца млосная спеўнасць начы,
Якая спяліла світальныя росы.
Люляў нашы душы акрылены сплаў
Бунтоўнай свабоды і радаснай зморы
У ложку з густых,
Долам высланых траў,
З адбітых у кропельках свежасці зорах.
Плыве цуд са мной праз жыццё і цяпер,
Яго не замгліла расхлістанасць долі,
Бо пальчык -
Да шчасця ўказальны той перст -
На вуснах ляжыць
І не знікне ніколі.

**Першы пацалунак**

Ляжаў вялікі, белы камень тут -
Каля бруі прыветнае крыніцы.
Як брат з сястрою, у любімы кут
Мы беглі, каб красою наталіцца.
Але ў той дзень загадкавы віхор
Нас выхапіў з зямнога летуцення,
Дзе конікаў не моўк бязладны хор,
Мільгалі слюдзяных стракозаў цені.
Паўстала тое, што лупала ў снах,
Сатканых з позіркаў і шэптаў кветак.
Маланкавай вясны зялёны шлях
Імкнуўся спешна да раскошы лета.
Раптоўна свет аслеп,
Аглух
І сціх,
Зачараваны смеласцю спакуснай.
Забыўшыся няўзнак на ўсё і ўсіх,
Раскрыліся, нібы пупышкі, вусны.
Дайсці ў трымценні не змаглі яны
Да таямніц спякотнага кахання.
Хоць мы былі прад вечнасцю адны,
Ды толькі сутыкнуліся дыханні.
Такога пачуцця не меў пасля,
Хоць звязана жыццё ў апошні клунак.
З-пад ног сплыла і знікла дзесь Зямля...
А гэта быў мой першы пацалунак.

**Дол**

Зямля крывічоў гадавала мяне
Не толькі акрайцам зайчыным.
Вякоў чую пот
І на ўласнай спіне,
Слязою на вейках - Айчына.
Жыццёвы цалік - не азартлівы куш,
Яго не ўзарэш без пакоры.
Узяўся за гуж,
Не кажы, што не дуж,
Вядзі баразну аж да зорак.
Хоць цела няўмольна карэніцца ў дол,
Ёсць неба над стомленым краем.
Гляджу ў лік касмічны,
А потым наўкол -
Набожна душа замірае.
Красу не ўтрамбуюць ні сквапны хатуль,
Ні звадных рахункаў забойнасць.
Углыб працягаю,
Знікаю адсюль
З адзіным набыткам - любоўю.
Сюды і туды для маўклівых надзей
Спрадвечна расчынены дзверы.
Хто веру цярпліва спяліў між людзей,
Упрочкі ідзе з той жа верай.
Душа не загіне...
На гэтым стаім,
Каб смутак нязводны адолець...
Таму мне не страшная вестка аб тым,
Што хутка я сам стану долам.

## Застацца дома

Запомніўся дзень у зялёным жыцці,
Мой выклік не ясны нікому.
У школу раптоўна рашыў не пайсці,
Застаўся дома.
Карцела з паперай пабыць сам-насам,
І я прадчуваў падсвядома,
Што выпырхнуць з сэрца на волю радкам
Найлепей дома...
Пяром пракладаю да роднасці след,
Дасюль невядома аскома
Ад думкі, што месціцца ўвесь белы свет
У слове - «дома».
Жыць тут, дзе зямля і нябёсы - твае,
Дзе нават салома ядома.
Хоць здрада табе пельку рабскую ўе,
Застацца дома.
Быць тут, дзе балюе раз'ятраны гвалт,
Дзе дух горды сціснула кома,
Трымацца, апошні акоп не здаваць -
Застацца дома.
Мой век праляцеў, як імгненне адно,
Ды вернасць не скруціць утома.
Я рана адчуў, што такое яно -
Застацца дома.
Хачу і фінал непадманлівы мець,
Каб з ласкі гасподняй, вядома,
Прыпяць тут,
Дзе жыў,
Непадкупную смерць -
Застацца дома.

**Крутыя дні**

*Віктару Казько*

Быццём такі сюжэт закручаны,
Што стогне ў вечным сне Шэкспір.
У дзён крутых, дарэшты ссучаных,
Паехаў розум набакір.
З чужога шалу надта круціцца
І ў непрычынных галава…
Усё, над чым стагоддзі рупяцца,
Бярэ ў абдымкі схоў-трава.
На дрэве нацыі - пі лісціка,
Сякуць манкурты карані.
Наперад каляндар не лісціцца,
Назад адкручваюцца дні.
Пад пугай круцялёў-палітыкаў
Чарговы «судны час» прыйшоў.
Пагоны цэнзараў і крытыкаў
Вісяць над кожнаю душой.
Няўцям ім ісціна няўмольная,
Што ў мове молада звініць:
Жыццё - таксама рэч крамольная…
Ды паспрабуй яго спыніць!
Свет не ўратуюць веры літары,
Але мы пішам нездарма.
Ні ў кога не папросім літасці.
За што?
У нас віны няма.
Наш хлеб і слова не пазычаны
У тых, хто сквапна куш грабе.
Мы да жыцця не ў апазіцыі…
Мы проста самі па сабе.
Глядзіцца ў Прыпяць прывід-выпаўзень
Сляпы чарнобыльскі заход…
На волю нас не хоча выпусціць
Маной задураны народ.
Вунь ён жуе падляпку тухлую,
Не давіцца чужым дзярмом.
А мы з натоўпам не патупаем,
У нас ёсць свой і харч, і дом.
Дні, толькі праўдай гадаваныя,
Пачуюць роднасці струну.
Праб'юцца сэрцы надарваныя
Праз цемрашальства круцізну!

**Косы**

У магіле братняй, пад грудком у полі
Сняцца хлопцам косы, сніцца хлопцам воля.
Косы, што сцякалі на плячах каханай,
Косы, што ўзняліся ў бітве апантанай.
Сніцца тая воля, што не памірае,
Што народ сагнуты вечна дакарае.
Вестку шлюць нашчадкам з цемры касінеры
Нельга жыць на свеце без надзей і веры.
Іхніх сноў пазбыцца сёння немагчыма,
Зноў рыхтуюць пастку злыдні для Айчыны...
Беларусаў годных я шчасліва мрою,
Што за волю выйшлі крэўнай грамадою.
Сцяг лунае горда пад паходам смелым,
Колерам найлепшы - бел-чырвона-белы.
Лашчаць промні сонца з маладых нябёсаў
Косы залатыя, баявыя косы...

* * *

«Я ж твае ножкі не памарожу,
Я ж твае ножкі ў шапачку ўложу...» -
Божачка, як жа кранальна гучыць!
Нават калі мужычок нецвярозы
Спеў цягне ў жоначкі злой на плячы.

Тайна адданасці з моваю мілай
Пасябравалі навечна даўно,
Каб пабываць неўтаймоўную сілу,
Сцятыя, злітыя моцна ў адно.

Гэта жыццё пад сабою варожыць.
Свеціцца ўсмешка...
І раптам - сляза...
«Я ж твае ножкі не памарожу,
Я ж твае ножкі ў шапачку ўложу...»
Лепей не можна пра любасць сказаць.

**Імёны**

Звонкі смех прагучыць над планетай,
Трывогай забранай,
І здаецца святлейшым
Замглёны жыцця далягляд.
Дарагія імёны -
Марынка і Франак -
Так у сэрцы люляю,
Нібыта ў руках птушанят.
Я люблю Беларусь,
І за гэта не раз пакараны,
Ды прынёс раптам лёс на расстанне
Святы талісман.
Веснавыя імёны -
Марынка і Франак -
Прабіваюць,
Як парасткі,
Скрухі скалелы дзірван.
То сінічка,
То жаўранак будзяць будзённасць старанна:
«Уставай, мой дзядудька…
Дзянёчак прыгожы для нас…»
Весткавыя імёны -
Марынка і Франак -
Роднай моваю звязваюць моцна
Няўстойлівы час.
Азірнуся,
А там - рыжы хлопчык у майцы падранай
У гародзе замёр
І ўглядаецца ў космас цішком…
Маладыя імёны -
Марынка і Франак -
Лоб, гарачы ад думак,
Халодзяць сваім скразнячком.
Кожны лічыць,
Што ён адыходзіць у вечнасць зарана,
Толькі нельга спыніць на зямлі
Кругавы лістапад…
Залатыя імёны -
Марынка і Франак -
Мне падсвечваюць шлях,
Па якім не вярнуся назад.

**Паядынак**

З лютасцю птушкі цярэбяць
Пёркі ў знямозе няўдач:
Белыя - змрочны крумкач,
Чорныя - сонечны лебедзь.
Праўду заўжды атакуе
Новым напорам хлусня.
Тут перамог не святкуюць,
Бой немагчыма суняць.
Сцяты ў ціскаx даўняй схемы,
Моўчкі гляджу з-пад павек.
Я - не анёл і не дэман,
А паміж іх - чалавек...
Злыдні віжуюць і грозяць,
Носяць паклёпы «наверх».
Косткай у горле - мой роздум,
Добры чытацкі давер.
Толькі з крыві ім не выбіць
Горкую праўду маю.
Я за яе - пастаю...
Мной цвёрда зроблены выбар.

**Паштоўка Ніне Мацяш**

Вітаю, летуценніца-сястра!
Прабач за стук раптоўны ў аканіцу.
Адчуў я - вестачку паслаць пара,
Не за гарой, а зараз пакланіцца.
Мае эпісталярныя даўгі
Па-царску ты заўсёды прабачала...
Твой родны лік і голас дарагі
Я помню і ў пранізлівым маўчанні.
Я згадваю цябе, калі ўначы
Радком незацугляным сэрца сочыць.
Яднае нас з табой праз далячынь
Паэзіі калінавы масточак.
Мы словам служым людзям і зямлі,
З якімі Тут і Там не размінуцца.
А што яшчэ ў жыцці сваім змаглі?
Не разлюбіць,
Не здрадзіць,
Не сагнуцца!
Мы крыўду п'ём з агульнага каўша,
Але да праўды сцежку вольна торым.
Руплівая, збалелая душа
Знаходзіць голас радасці і гора...
У юным небе сонечны прамень
Пагнаўся жвава за апошняй знічкай.
І прыйдзе, Ніна, наш жаданы дзень...
Дзень добры,
Мая мілая сястрычка!

## Недзе грыміць…

*Гримить! Тайна дрож пронимав народи,*
*Мабуть, благодатная хваля надходитъ…*
Іван Франко

Недзе грыміць…
А ў знаёмых ваколіцах ціха.
Толькі варушацца цені
Адвагі выяў.
Воляй цяжарная
Столькі вякоў парадзіхай
Курчыцца ў схватках бясплодных
Айчына мая.
Недзе грыміць…
Там акраплены гордай крывёю
Прывід свабоды
Імкліва нарошчвае плоць.
Лёс заклікае рабоў
Стаць у шэрагі вояў:
«Скідвай ярмо
І наперад ахвярна выходзь!»
Недзе грыміць…
А тутэйшыя давяцца болем.
Дні, расстраляныя страхам,
У прорву ляцяць…
Божа, калі ж мы прытулім
Жаданую волю
Так, як матуля
Сваё дарагое дзіця?
Недзе грыміць…
Там хочуць жыць.

**Я ўжо там..**

Першым
Крыўды даверліва ўсім выбачаю,
Для сябе не чакаючы
Пэўных амністый.
Я ўжо там,
Дзе няма пі хлусні,
Ні адчаю,
Дзе душа адпачне
Ў цішыні прамяністай...
Сэнс і сутнасць жыцця
Застаюцца загадкай...
Можа ў гэтым і ёсць
Найвышэйшая ласка?
Вырак тых,
Хто ахвочы судзіць і загадваць,
Не страшней,
Чым пранізлівасць
Споведзі ўласнай.
У мінулым адною нагою - сягоння,
А за ім - свет,
Што вытканы кроснамі мрояў...
Ні паклёпы,
Ні плёткі мяне не дагоняць...
Я ўжо там -
За туманам,
За дальняй гарою.

**Мясцовы маршрут**

*Адзе Райчонак*

Аўтобус яздой нетаропкаю,
Свой курс пракладае ў імгле.
Дыханне людское кроплямі
Сцякае па золкім шкле.
Напоўнены жартамі, плёткамі,
Салон закружыў галаву.
Я разам з дзядзькамі і цёткамі
Да родных дымоў плыву.
Дзесь там чаўнакуюць «боінгі»,
Спявае камфорт аўтастрад.
А тут на заўсёдных выбоінах
Душа далятае да пят.
Хоць лічаць мой край прарэхаю,
Прарочаць яму забыццё,
Але над счарнелымі стрэхамі
Нязводна віруе жыццё.
Нягеглае, ды неўміручае
Яно скіпе змору пакут.
І нават да горняй кручы я
Паверу ў мясцовы маршрут.

**Вялікая дзяльба**

Што нам век дваццаць першы
Прынёс,
Акрамя спёкі,
Ліўняў,
Парошы?
Вельмі смачна, амаль узасос
Зноў цалуюцца ўлада і грошы.
Заціскае народы пятлёй
Махляроў кругавая парука.
Тое,
Што па зямлі,
Пад зямлёй,
Ім забраць,
Падзяліць надта рупіць.
Шал распусты,
Дурной круцізны
Нарастае.
І гэта - не вечар.
Уяўляю, як сквапна яны
Па кішэнях распіхваюць
Вечнасць.
Наплывае хлусні
Едкі дым,
І здаецца ўжо неба з аўчынку..
Назірае сурова за ўсім
Той,
Хто зверыць прамовы і ўчынкі
У палацах балююць сычы
Ды рагочуць з душою пахілых.
А над светам праўдзіва гучыць
«Зямля да зямлі,
Гірах да праху,
Пыл да пылу...»

**Дзе я?**

Мой узрост даляцеў да такое мяжы,
На якой не ратуе надзея...
Хоць акрайчык гадоў
Трэба годна дажыць,
Ды нялёгка вызначыць:
Дзе я?
Так абрыдзелі страх і ныццё грамады,
Зацяганасць старых дэкарацый...
Не хачу ў час апошні брысці ў нікуды,
Пустадомкам нахабным скарацца.
Прапісны аптымізм суцяшае дарма,
Адбываецца дзіўная дзея -
У мінулым, даўно мяне ўжо няма,
У будзённым таксама...
Дык дзе я?

**Эцюд**

Каханая позірк імклівы
Гарэзліва кіне з-пад веек,
А потым прыстоіць маўкліва,
Кранае рукою завею.
Сняжынкі адсвечваюць шчасцем,
І кожная, быццам жывая.
Цалую,
Як крыжык,
Запясце,
Што міма мяне праплывае.
Адказу няма на пытанне:
«А што ж там у долі на донцы?»
Усё ад баліць і растане,
Як снег на пяшчотнай далоньцы.

**Адкуль?**

Адкуль любові музыка сыходзіць,
Якая нараджае адкрыццё,
Што досвітак і чырвань на заходзе -
Не дар,
А волі вечнае быццё?
Адкуль узніклі хвалявання дрыжыкі,
Як плоць знаходзіць высілкі свае,
Каб не баяцца непапраўнай рызыкі,
Калі апошні выбар настае?
Душа цішком збярэ любую дробязь,
Завяжа моцна роднасці хатуль.
Ты крок насустрач смерці смела зробіш,
Каб засланіць сабой жыццё ад куль...
Адкуль любові музыка,
Адкуль?

## 100

*Самаму любімаму Беларусу -*
*Барысу Кіту*

Вандроўнік крокам выкоўвае знак,
Дайсці паспрабуй да такое вяхі:
Адзінка нагадвае млын-вятрак,
Нулі - як паўнюткія зернем мяхі...
Карэліцкі хлопчык разбег набіраў,
Калі засяшаўся за родны парог,
Ад тлуму
Частых зямных пераправ
Да волі
Бясконцых касмічных дарог.
Ён смела каноны ўсе парушаў,
Цалік прабіваў непаўторнай хадой.
Пакуты,
Славу
Спазнала душа,
Але засталася павек маладой.
Я іс годна,
Высакародііа ляжыць
Corona astralis[1] па мудрым чале...
Глядзіш па яго - і хочацца жыць,
Любоўю,
Надзеяй
І верай сталець.
Хоць шмат у быцці прывабных спакус,
Імкненне да волі не знішчыць ніхто.
Пра гэта сведчыць сабой Беларус,
Якому разгоніста стукнула 100!

---

[1] зорны вянок (лац.)

**Чарада**

Няшчасцем звыклым гадавана,
А дзе бяда - гам лебяда,
Прыйшла не позна і не рана
У свет пагодкаў чарада.
Але сяброў - адданых, шчырых
Яшчэ далёкая зіма
Дачасна выпраўляе ў вырай,
Адкуль звароту ўжо няма.
Ды толькі ў асабістых драмах
Мы не прадалі гонар свой,
Каб годна да святое брамы
Ісці з узнятай галавой.

**Трымайся!**

Натужна рыпяць долі грузнай гужы,
А час зноўку тузае лейцы.
Трымайся,
Па духу мой брат,
Дзе б ні жыў -
У Лельчыцах,
Воршы,
Вялейцы.
Хоць ты замарыўся ў крутой барацьбе,
Адстойвай дабро без прынукі.
Трымайся, таму што глядзяць на цябе
Л юбімыя дзеці і ўнукі.
Трымайся!
Адчайна тапіць у віне
Абразы і крыўды няварта.
Малюся,
Хай дом твой заўжды абміне
Аблога інсультаў, інфарктаў.
Хоць цяжка, але не махай ты рукой,
Жывым не здавайся аблудзе.
Трымайся яшчэ па прычыне такой -
Замены нам,
Родны,
Не будзе.

## Падноўленае retro

*Леаніду Дайнеку*

Не нам судзіць сутычкі пекла з раем,
Што паўстаюць пакуль што толькі ў снах...
Але смачнейшым стаў жыцця акраец,
Які бязбожна чэзне на вачах.
Хоць падганяюць да стаптаных тапак
Сляпых хвароб чырвоныя сцяжкі,
Жывую кроў падраненых метафар
Мы чуем, як галодныя ваўкі.
Ды помнікі сабе не варта ставіць...
Як быццам нехта долю прапалоў,
Зноў вырастае цішыня густая
На тле пякучых і забойных слоў.
Тады якую трэба браць танальнасць?
Якой цыганцы ручку залаціць?
Ратуе геніяльная банальнасць -
Ляціць жыццё...
Жыццё яшчэ ляціць...

**«Стабільнасць»**

Ранак святлом атуліў, як заўжды,
Цела з душою шапталіся згодна...
Кран жа не выдаў гарачай вады,
Потым не стала яшчэ і халоднай.
ЖРЭА паслаў ён «удзячны паклон»,
Выйшаў з кватэры - вачам не паверыў:
Хтосьці разбіў уначы дамафон,
Насцеж распяліў зламаныя дзверы.
Доўга стаяў і паветра каўтаў,
Млосна язык халадзіў валідолам.
Так да прыпынку паціху дапяў,
Дзе гаманіў люд на мове «вясёлай».
Матам дзяцюк па мабільніку крыў,
Нудна гразіў, што туды ўсіх засуне,
І пол слабы не ішоў на адрыў -
Жабы выскоквалі з вуснаў красуняў.
Офіс сустрэў кіраўнічым «цяплом»,
Каб падагрэць супрацоўнікаў-»трутняў»,
Сем тлумачэнняў «разумных» прыйшло
Да чатырох учарашніх інструкцый.
Працу закончыў. Цяпер, як закон,
Трэба да крамы ісці па прыпасы.
Звыкла купіў малако і батон,
Пашыбаваў у ашчадную касу.
Там, у чарзе, павяло да сцяны.
Ён аглядаўся па ўсіх вінавата:
Скочыў нястрымана ціск крывяны
Так, як паслуг камунальных аплата.
Потым сядзеў за сталом між радні.
Што Бог паслаў - спажывалі нядоўга.
Тэлек на сон выліў цэбар хлусні...
Ну, а наогул,
Дзянёк быў цудоўны.

**Чатыры гады**

Чатыры гады-
не чакаў я гора...
Так, не было прадчування бяды.
Але падпаўзлі, каб схапіць за горла,
Сляпыя, глуханямыя гады.
Мой лёс на прыцэл узяла мярзота:
Спачатку паклёпы, бруд,
А пасля
Надзённую лусту вырвалі з рота,
Хацелі нават пазбавіць жылля.
Я выжыў, бо маю рукі і розум...
Аднак боль дагэтуль душу шкрабе:
Дзе спачуванне ад «добрых і розных»
Чаму не бачаць,
Не чуюць цябе?
Цяпер толькі брэх,
Больш няма блакады,
Але даганяе шоргат жуды...
Паўзуць за мной шматгаловым гадам
Тыя чатыры...
Чатыры гады...

**Надзея**

Зноў кружыць галаву мне
Роздум даўні,
Бо гэта праўда, што тут ні кажы:
За намі - прывіды,
А побач - здані,
На даляглядзе - толькі міражы.
Край курчыцца ў жабрацтве,
У прымусе,
Над ім грыміць хлусні
Пустая медзь.
А хочацца сапраўднай Беларусі,
Хай на сыход,
Ды ў вочы паглядзець.
Які трагічны час!
Дайшлі да краю,
Хоць век тэхналагічны на дварэ.
Апошняю надзея памірае...
А што, калі і сапраўды - памрэ?..

**Разам і асобна**

Розум прапіты ў гульбе беспрычыннай,
З ім і сумленне пусцілі на звод.
Страх і халуйства сагнулі Айчыну...
Ведаю я, што такое - «народ».
Тых, хто прадаў мову,
Годнасць
І праўду,
Як мне прыняць за сваіх,
За радню?
Кажаце: «Разам!»?
Рашуча папраўлю -
З большасцю не спажываю хлусню!
Вось і суседзям падачкамі собіць
Не выпускаць нас з «калгаса» ніяк.
Я ў той канструкцыі - «аднаасобнік»,
Неераможна зацяты «кулак».
Разам - «чарніла»,
Папса,
Конкурс «місаў»,
Мат у гаворцы і вунь — на сцяне...
Хопіць!
Дзікунства з агульнае місы
Чэрпайце,
Хітранькія,
Без мяне.

**Непальскі хлопчык**

У непальскага хлопчыка позірк такі,
Што любы адвядзе збянтэжана вочы.
Ён глядзіць так, нібыта прамовіць хоча:
«Слабакі!»
Ясна нават закончанаму дзіваку -
Гэты юны хлопчык роблены не пальцам.
Але топкі пальчык спрытнага непальца
На курку.
Аўтамат Калашнікава ледзь перарос
Падшыванец, каму даверылі зброю...
У яго, хоць ён лічыць сябе героем, -
Страшны лёс.
Раздзіраюць людзей ва «сваіх» і «чужых»
Камуністы,
Фашысты
І мааісты.
Толькі ўсе яны - хіжыя папулісты...
Многа іх.
А фінал непазбежна прыходзіць такі:
За нахабны падман належыць расплата...
У непальскага хлопчыка да аўтамата -
Два ражкі.

**Лікі**

*Памяці Анатоля Сыса*

Я крочыў вуліцай ля «Акіяна»,
Ды рантам голас Сыса паклікаў.
Стаў як укапаны, зачараваны
Яго незвычайна прасветленым лікам.
Праз стому нагрузак -
Крутых, грахоўных -
На свет прабіваліся рысы святога.
Паэту пісалася.
Вольна, роўна
Ён вершы чытаў,
Сыпаў імі, бы з рога.
Прамовіў, як часу прайшло парадкам,
Напэўна, гамонкаю сэрца расчуліў:
«Давай мяняцца...
Бяры майку, братка...
А мне, калі ласка, аддай ты кашулю».
Абмен адбыўся.
Зноў кожны рушыў
Сцяжынай сваёй
Праз жыццёвыя пожні.
Было так,
Нібы паглядзелі ў душы,
Нібы падзяліліся лустай апошняй.
Мы ўсе без астатку - народ той самы,
Які быццё неўміручае вершыць,
Які яднае камедыю з драмай,
Які цалуецца з пляшкай пад крамай,
Якому жыцця не шкада на вершы.
Ён тым па-сяброўску ў каршэнь натоўк бы,
Што носяцца:
«Культавы...
Першы...
Вялікі...»
Я крочу,
Выхопліваю з натоўпу
Аблічча, якія нагадваюць лікі.

**Шэрыя сцены**

Шчасця міг крывёй аплоцім,
Мы з табой, нібы на сцэне.
Душна душам,
Цесна плоці
У абрыдлых шэрых сценах.
Ах, як хочацца на волю,
Святкаваць наноў спатканне
Ці ў бары,
Ці ў спелым полі...
Уратуй жа нас, чаканне...
Радасць блісне з-пад павекаў,
Знікнуць грукат,
Крыкі,
Цені...
І ў абрыдлых шэрых сценах
Свята ёсць для чалавека.

## Двое

Каханне нeспасціжную прычыну
Не разгадаць ні зараз, ні пасля...
Над існасцю -
Жанчына і Мужчына,
Злітыя,
Як неба і зямля...

**Каханне - гэта свабода**

Яму няма ні пачатку,
Ні зводу,
Яно -
Прыцягненне і барацьба...
Разам з каханнем прыходзіць свабода
Нават у сэрца раба.

**Рамяство**

Я люблю і цаню сваё рамяство,
Ды не веру ў заклік:
«Ні дня без радка!»
Бо не могуць весці паэзіі шво
Без супынку
Розум,
Душа
І рука.
Так бывае, што толькі падзеяй жыву,
Не даю і нічога сабе не прашу...
Я на рукі бяздумна кладу галаву,
Проста дыхаю,
Каб адагрэць,
На душу.

**Страўнік**

Мы крочым,
Як кажуць,
Дарогаю слаўнай,
Навука бярэ за бар'ерам бар'ер,
Уносяцца змены ў ландшафт, інтэр'ер...
Але верхаводзіць у кожным з нас страўнік
Адразу дыктатар і апазіцыянер.
Хоць ён не ўзвялічаны і не абраны,
Не мае ніякай «жалезнай рукі»,
Аднак побач з ім выглядаюць тыраны,
Як самыя дробненькія слабакі.
Вось хто не трымціць,
Не баіцца нічога -
Ні торбы жабрачай,
Ні нават турмы.
Бурчыць па крыўдзіцеляў гучна і строга
Тады, як пад венікам мышкамі - мы.
Мяняецца свет назаўжды,
Непапраўна...
Ці ў лепшым кірунку?
Вазьмі-тка - правер!
А над усімі і ўсім
Уладарыць страўнік -
Галоўны дыктатар і апазіцыянер.

**Знікаюць людзі..**

Людзі знікаюць,
Калі да аскомы ім пабрытае
Слухаць грукат жалезны,
Трыбунныя галасы.
Яны зашываюцца
Як мага падалей -
У скіты,
Пустыні,
Глухія лясы.
Людзі знікаюць,
Калі ўпадабаюць самаўлюбёна
Ранг звышчалавекаў,
Незаменных правадыроў.
Яны заплываюць
Незваротна, да скону -
У слёзы,
Пакуты,
Бязвінную кроў.
Людзі прападаюць,
А нелюдзі кіруюць і судзяць,
Крочаць без масак на горадзе
Ля твайго пляча...
Стоп!
Ці ж гэта жыццё,
Калі знікаюць людзі,
А ўсе пра тое ведаюць
І маўчаць?

**Раны**

Хірургі на целе
Аўтографы пішуць...
Ніхто не пярэчыць
На гэты конт -
Вылазяць то траўмы,
То ўпартасці лішак...
Смяюся -
Ідзе еўрапейскі рамонт.
Калецтва любое
Не трэба нікому,
І скальпелю дзякуй -
Палёгку прынёс.
А як мне змірыцца,
Калі па жывому
Крамсаюць дачасны
Нацыі лёс?
Жыццё раўнавагі
Заўсёды хацела,
Ды розніца ёсць,
Хоць яны - спарышы.
Няхутка,
Аднак жа рубцуецца цела...
Крывавяць,
Не гаяцца раны душы.

**Бяроза над Свіцяззю**

*Ніне Мацяш*

Хто бярозу прыгнуў аж да самай вады -
Вецер,
Снегу цяжар
Ці то проста гады?
Белы ствол над сінечай трымціць, як прамень,
Асвятляе маленства і сённяшні дзень.
Хоць мой час пацьмянеў і сыходзіць на клін,
Помняць босыя ступні
Шурпаты трамплін,
Як з вярбы нахіленай даваў я нырца,
Каб заглыбіцца ў лёс,
Каб плысці да канца.
Вось і рыса падведзена снегам кары,
А над ёй - шчасця плёсы і болю віры.
Я на ствол не ступаю -
У мроях той крок,
Ды бярозе паклон за наступны радок:
«Выпаў кон дарагі мне ў астатнім жыцці,
Каб на промню любові над смерцю ісці...»

**Прывал**

*Аляксею Марачкіну*

За век свой наглядзецца давялося
На глупства несусветнае падзей...
Як добра тут,
Дзе схіленым калоссем
Зямля вітае
Добры час надзей!
Цяпер, а не вясною гаманкою,
Мне цешыць вочы родны далягляд,
Бо вырастае з мудрага спакою
Асэнсаванне радасці і страт.
Шапоча ціха поле залатое,
За ім трымціць азёрная вада...
І ўжо няважна,
Дзе схавана тое,
Чаго ніколі нам не разгадаць.
На камень ля прытомленай дарогі
Прысяду,
Адкладу вандроўны кій,
Каб углядацца прагна,
Да знямогі
У белы свет - чароўны і нічый...

**Цёмны горад**

Падалося: у горадзе выюць ваўкі, -
Гэтак злосна скуголіць за шыбамі вецер.
Прадзімае наскрозь ён надзеі куткі,
Што яшчэ засталіся ў расхрыстаным свеце.
Прыпыняю радкоў разняволены рух,
Бо душа на паперу глядзіць, як сляпая.
Уладарна на лямпай асветлены круг
Цёмны горад, як хіжая здань, наступае.
Чорным полымем злізвае кроплі святла
Дыктатура цынічнага, шчыльнага змроку.
Разам з ёй у кватэру трывога прыйшла
І па вершы мае пазірае звысоку.
Рабскі час плодзіць статкі нямых і глухіх,
Нават сны заганяе ў ванітнае стойла...
Цёмны горад сціскае ў абдымках сваіх,
Не дае ён ні жыць, пі памерці прыстойна.

## Беларускі палігон

На беларускім палігоне -
Як у апошнюю вайну.
Штодзень нячысцікі ў пагонах
Таўкуць тутэйшых у спіну.
Не дачакацца дапамогі -
Той з клюшняй, гэты з капытом.
А прыпячэ - прыкрыцца могуць
Людзьмі, нібы жывым шчытом.
Маўчыць парод.
Душу і цела
Спавіў намёртва страху дым.
А ўсіх няскораных і смелых
Гайня знішчае па адным.
Ды родны грунт я не пакіну,
Дзе слёз - як росаў на траве,
Бо веру, што мая краіна
Мільённа выдыхне: «Жыве!..»
То праўда крыўду ў кут пагоніць,
То гвалт зноў засціць свет сабой...
На беларускім палігоне
Грукоча невучэбны бой.

**Ні слова!**

Тут хлусаў тусоўка правіць,
Тут сэнсу хістаецца цвердзь.
Пакуль не пануе праўда -
Ні слова пра смерць!
За слова па бой суровы
Выходзьце - і ратнік, і смерд.
Пакуль не паўстала мова -
Ні слова пра смерць!
Надзея залечыць раны,
Не страшна і новыя мець.
Пакуль сцяг і герб забраны -
Ні слова пра смерць!
АМАП грозны крок паволіць,
Сціхае бравурная медзь...
Пакуль не займелі волю
Ні слова пра смерць!

**Устаньце!**

*Калі мы не ўстанем самі -*
*Не падыме нас ніхто.*
Уладзімір Караткевіч

Само жыццё - свабодзе радня,
Нельга ісці, згінаючы выю.
Мёртвых нам не ўдасца падняць...
Устаньце, жывыя!

**Дождж са снегам**

Праплывае па долі маёй
Лёгкі цень нечаканае хмаркі...
Дождж са снегам над весняй зямлёй
У анёла з нячысцікам сварка.
Змалку ветраны дзень я люблю,
А з табою - найбольш і адчайна.
На ляту мілы позірк лаўлю,
Як акрайчык галодная чайка.
З незнаёмай трывогай гляджу
На дзівацтва нястомнай прыроды:
Як сплятаюцца пальцы дажджу
З сівізной снегавой назаўсёды.
Хутка сэрца ў забойчым жыцці
Не стрывае шалёнага бегу.
Гэта вечнасць у вочы ляціць...
Гэта ты, гэта я -
Дождж са снегам.

**Вёска Святая Воля**

Тут нештачка за назвамі
Схавана і замылена.
Як зведаць, што выказвае
Гуллівае Шуміліна?
Святочных вербаў коцікі
Святлеюць несурочана.
Пра чый жа лёс маркоціцца
Вясновае Сіроціна?
Касіры і бульба сопкая...
А што там больш убачыцца,
Дзе гнецца ў крук над соткамі
Цярплівая Гарбаціца?
А ў гэтай вёсцы здолеў я
Адчуць між ліп і ясеняў,
Што за Святою Воляю
Высокі сэнс праяснены.

## Лёгкі хлеб

Лёгкім хлебам паэзію лічаць, стараюцца
«Ад сахі і станка» прарвацца да слова...
Ды метафары ўсё ж мазалём не ствараюцца,
Нельга рыфмы спарадкаваць, быццам дровы.
Развітаюся раптам я з пэўнымі лямкамі,
Усміхнуся змене былых дэкарацый...
Ты чаму надарвалася, сэрца сялянскае,
На такой не мужыцкай, а «панскай працы»?

## Мая сасна

Інфаркт валіць люд, як лес, у нахлёст...
Я ўдзячны лёсу, што столькі агораў...
Мяне дабівае не сталы ўзрост,
А глупства, якое душыць за горла.
Я так стаміўся, што проста засну,
З куточка вуснаў прасочыцца сліна...
А покуль хочацца бачыць сасну,
Якая стане маёй дамавінай.

## Ваяводзінская альтанка

*Богдану Касановічу*
*У аўтаномным краі Ваяводзіна (Сербія)*
*ёсць завядзёнка летам пакідаць для*
*вандроўнікаў*
*у прыдарожных альтанках садавіну:*
*абрыкосы, грушы, яблыкі.*

На лаве шырокай сядзелі мы ўдвух,
Ламіўся пад садавінаю стол.
Было так спакойна і ціха наўкруг,
Што чуўся зумкат замораных пчол.
Вячэрняе сонца ўглядалася ў твар,
Завершваўся зноў паварот Зямлі.
А ў думах раздзьмухваўся болю пажар:
Куды мы ў аблудзе сваёй зайшлі?
Куды адплыла да свабоды любоў,
Дзе дзеўся ранейшы нязломны дух?
Народ памяняўся на статак рабоў,
Які пільнуе «жалезны пастух».
Як вырвацца з даўняй, заклятай бяды,
Як нам асядлаць няўстойлівы час,
Калі за гатоўнасць людской грамады
Прымаюць не лепшых,
А горшых з пас?
Але мы не ганім, а любім свет,
Хоць праўду баронім,
На гэтым стаім...
Таму я пасунуся,
Як і сусед, -
На лаве шырокай ёсць месца ўсім.

**Ляйпцыгскі трамвай**

Я гляджу праз сонечнае шкло
На урбаністычныя «пейзажы».
Як жыццё разгоніста прайшло,
У трамваі ляйпцыгскім заўважыў.
Бачу дні былыя, як праз дым,
Сэрцу хвораму ніяк няймецца,
Зноў сябе прыпомніў маладым
У вандроўцы па зямлі нямецкай...
За вакном плыў той жа краявід,
Ды трымцеў ад крыўды люд зялёны,
Бо ў трамваі злосны інвалід
Нам услед сіпеў свае праклёны.
Дзе былы танкіст згубіў нагу,
Атрымаў жахлівыя апёкі?
Што згадаў ён - Курскую дугу,
Ці пакуты ў пекле пад Глыбокім?
Невядома.
Ён пачуў славян,
Твар увесь перакрывіўся нават.
Успаміны і нямоглы стан
Выліліся ў бурную нянавісць...
Мы ж пасля ўступілі ў слоўны бой
Пра вайну, пра гераізм і страты.
Хто злачынцам большым быў у ёй?
Але мірам скончылі дэбаты.
Гітлер або Сталін?
Кожны гад!
Свет ад пыхі іхняе залежаў.
Розніца адна:
Не наш салдат
Першым перайшоў чужыя межы.
Ляйпцыг.
Мчыць трамвай...
Больш інвалід
Страчанай нагой не дакарае.
Адыходзяць ворагі ў нябыт,
Міраць іх - агонь,
Зямля сырая...

**Праклятыя пытанні**

*Дзмітру Паўлычку*

Жыццё без свабоды лічу я расправай,
Паэту хапае і ўласных згрызот:
Бяссонная ноч, як падсудная лава,
А новы світанак, нібы эшафот.
Спрадвеку ў душы неспатолена ўецца
Праклятых пытанняў нямая гурма...
Былое гукнеш - сто разоў адзавецца,
Наступнае клікнеш - адказу няма.

**РБ**

*На беларускім тэлебачанні ў перадачах і ў рэкламе пастаянна гучыць абрэвіятура - РБ.*

Раскрадаюцца налам, безналам
Скарбы продкаў бязлітасным чынам.
Пустадомкаў гайня намяняла
На РБ нават назву Айчыны.
Вось і ходзіць яна сёння крыва,
Ды хлуснёю бразгоча па звычцы,
Як пустая бутэлька з-пад піва
У вагоне начной электрычкі.
Зноў слязою скоціцца з веек,
Соллю выступіць на гарбе...
Час свабодай настойліва вее,
А тубыльцы - ні мэ, ні бэ.
Эх, РБ ты маё, РБ!

* * *

Зманны міг, мімалётнае дзіва,
Як крынічка ў святой старане,
Па душы так сцякае імкліва,
Што журботна становіцца мне.
Гэты твар, валасоў аблачынка,
Постаць зграбная, як каласок, -
Цуд такі на звычайным прыпынку,
Што міжволі суцішваеш крок.
А яна свет цалуе вачыма,
Нешта піша на небе рукой.
Як да месца ў пейзажы жанчына!
Я ніколі не ўбачу такой...

**Люблю Украіну**

*Свою Україну любіть,*
*Любіть її... Во время люте,*
*В остатню тяжкую минуту*
*За неї господа моліть.*
Тарас Шаўчэнка

Топяць імя тваё гордае ў слоўным, паганым брудзе,
Воля твая для зласліўцаў, як быццам у горле косць...
Лёгка любіць Украіну, што некалі будзе,
Я ж абдымаю тую, якая ёсць.
Згадваю годную веліч асветленых сонцам прастораў,
Каб урываліся радасна ў грудзі мае наноў
Хвалі дняпроўскія, стэпы, Карпацкія горы,
Спелыя нівы, пушчы, квецень садоў.
Шлях Украіны не ўдасца ніякай хлуснёй знявечыць,
Сцяг і трызубец не вырваць нікому з яе рукі.
Сэрцы нашчадкаў жывіць дух Запарожскай Сечы,
Клічуць да перамогі паўстанцаў палкі.
Вучымся разам у жорсткім, глабальны няпростым свеце
Жыць без лакейскіх паклонаў на Захад або на Усход.
У беларускіх душах вечнымі на прыкмеце
Вы - украінцы: мудры, стойкі народ!
Не сумняваюся ў створаным вамі дзяржаўным цудзе,
Зноў на Крашчаціку крочу як брат, а не проста госць...
Лёгка любіць Украіну, што некалі будзе,
Я ж лашчу сэрцам тую, якая ёсць!

**Віртуальны пагост**

Шмат разоў я крышыў
Свой калінавы мост.
Вырастаў у душы
Віртуальны пагост.
Зноў будзённасці тлум
Крыжаваў бальшакі
Смелых, дзёрзкіх задум,
Закалыхваў радкі.
Дзівіць зношаны свет
Словам свежым, як сад,
Толькі той, хто паэт -
Ад макушкі да пят.
Шал натхнення гарыць,
Недзе ўнізе - зямля,
Нельга гэты прарыў
Адкладаць на пасля.
Крочыць трэба наўпрост,
Натаваць зорны ўздых...
І ў мяне ёсць пагост
Ненапісаных кніг.

**Ля помніка**
**Джорджу Вашынгтону**

Сышоў я з прыступак, дзе сонца паліць,
І раптам адчуў далонь па спіне:
«Містэр, зрабіце нам здымак на памяць.
Дзеткі, бяжыце хутчэй да мяне!»
Мужчына ў класічнай апратцы каўбоя
З усмешкай падаў фотаапарат.
Затым тэхасец прывёў за сабою
Жонку сваю, чатырох хлапчанят.
Прызнаюся:
Слаўна было здымаць мне,
Партрэт эпічны і просты такі:
Тата-асілак, прыгожая маці,
А побач - баравічкі-мацачкі.
Глядзеў па сямейку, дзе радасць, згода,
Бачыў, як спеліцца вольнасці плён...
Так, нездарма ваяваў за свабоду
Бацька Амерыкі -
Джордж Вашынгтон.

**Зялёная свабода**

Можа, пераблытаў я радню,
Можа, і з прыпіскай памыліўся?
Не даюць цягнуцца ў вышыню,
Хочуць, каб ніжэй травы сцяліўся.
Кажуць: ты працуй - ды будзь здароў,
Думаць і расці няма патрэбы.
А мяне цягнула да бароў,
Да тых сосен, што гавораць з небам.
Хоць да дыялога не дарос,
Дык паперу атрымаў для вершаў.
Паміраць каб жыць — зайздросны лёс,
Вечны круг быцця
І дрэвы вершаць...
Я пагладжу радасна кару,
Гляну на вяршалін карагоды.
Перад тым як знікнуць, гавару:
«Дзякую, зялёная свабода!»

**Берлінская сцяна**

Часта яна трушчыць вольныя сны,
Прывідам шэрым прыдушвае горла...
Некалі я ля Берлінскай сцяны
Пільна ўглядаўся ў падзелены горад.
Быў і тады, як крышылі яе,
Як абдымаліся люду лавіны...
Час праляцеў, а зліцця не стае,
Цяжка зрастаюцца дзве палавіны.
Шляхам падобным прайшоў беларус,
Захад і ўсход - берагі страшнай раны..
Помнікам стаў
Меж старых пыльны друз,
Але пад ім кружаць цені тыранаў.
Брыдка глядзець, як у свеце паўсюль
Хлам палітычны вылазіць па сцэну,
Каб расцярушваць прэтэнзій хатуль,
Каб нагрувашчваць нянавісці сцены.
Што там да немцаў, да ўтульнай зямлі
«Свой» і «чужы» зноў з'явіліся дома!..
Вось чаму нельга маўчаць мне, калі
Дэспаты рэжуць народ па-жывому.

## Кроплі

***
Яна - загадка, як ні глядзі
Ці хмельнай душой,
Ці вачыма цвярозымі,
А вывад напрошваецца адзін:
Жанчына -
Аб'ект не для нашага розуму.

***
Гэта мара спеліцца цішком,
Ды паэт не стане хэньць аспрэчваць,
Хоча хоць адным сваім радком
Зачапіцца за жыццё навечна.

***
Лебяда паднялася над доляю зрэбнай,
Як на твары маршчыністым шчэць.
Я прыняў тое, што ненавідзець патрэбна,
Каб паціху ад дум вар'яцець...

***
У краі суцэльных зняверцаў
Стаілася рабская ціш...
Тут нават сваёю смерцю
Свабоду не пракрычыш.

***
Я любіў жыццё: зары святло,
Прыпар дня і вечары з бяседаю...
А было яно ці не было -
Я цяпер і сам ужо не ведаю.

***
Не пішацца...
Паперы згроб
І кінуў у касцёр таропка.
Пацалаваў свой лёс у лоб...
На тым і кропка.

***

А наогул - на долю жаліцца грэх,
Столькі ўвішных людзей шчыруе наўкола..
Нават месяц у небе блішчыць, як лямех,
Адшліфаваны касмічным падзолам.

## Цана слова

Бяру «Буквар»,
Гартаю змест «Чытанкі»...
Ніколі не складзецца праўда ўся,
Каб помніць след на шыі Кастуся,
Нож у руцэ знясіленага Янкі.
Бярэ за Слова плату час пракляты,
Лёс генія яму - не ў галаве.
Але радок скрываўлены жыве,
Яго не могуць знішчыць нават каты.

**Шалёная Куля**

Я ў свеце жыву, дзе з крывавых падзей
Гісторыю ткалі заўжды псіхапаты.
Вайна не шкадуе ніколі людзей -
Шалёная куля пільнуе салдата.
А мне давялося пісаць на разрыў,
Мець рапы нягойныя нават без бою.
Шалёную Кулю я сэрцам злавіў,
Да кроплі сцякаю нясцерпнай любоўю.
Імчыцца, выпісвае вечнасці круг
У космасе чорным, наскрозь нелюдзімым
Планета, якую вандроўны мой дух
Давёў да памераў малое радзімы.
У свеце,
Дзе гвалт душы кволыя гне,
Дзе бляклaсць сцягоў,
Дзе прадажныя словы,
Зноў страх за людзей раздзірае мяне,
І толькі любоў застаецца замовай.
Стаю на каленях ля родных магіл,
Тут грозна ў вушах вецер памяці свішча.
Ці хопіць зямлянам сумлення і сіл,
Каб сцішыць дурных пустадомкаў ігрышча
І я, адыходзячы ў край нежывых,
Спытаюся так, каб унукі не ўчулі:
«Куды ты нясешся на злом галавы,
Планета няўдзячных -
Шалёная Куля?»

**Per aspera ad astra**[2]
(паэма)

*Барысу Кіту*

## *I. Бульба і крапіва*

У Пецярбургу - забойствы і голад.
Пераварот - да бяды паварот...
Вёска спрадвеку надзейней,
Чым горад,
Там выжыць можна ў любы недарод.
Хлопчыка вынес з імперскай сталіцы
Бежанскі лёс
Да святых каранёў.
Толькі няма дзе і тут прытуліцца,
Душыць нястача панылая зноў.
Войскі нянавісцю звыклай
Цвяліла
Доўга каля Сапатніцы вайна,
Людзям накінула страх і магілы,
Выграбла кублы, засекі да дна.
Ходзіць малы
Па знявечаным краі,
Смутак растурзвае
Позірк і слых.
Ён крапіву маладую збірае,
Бульбу шукае на гонях пустых.
Дзень перабыць непярэліўкі нашча.
Коні - бы калодзеж,
Накручвай кругі.
Пальцы згалелыя млеюць і лашчаць
Клубень нядрузлы,
Як скарб дарагі...
Доля,
Спагадай сваёй не сляпая,
Бачыць той шлях,
Што да зорак пралёг...
А згаладнелы Барыска капае
Бульбу гнілую на графскіх палёх.

---

[2] 'Праз церні да зорак (*лац.)*

За тое, што ён ацалеў, жыве,
Дзякуй бульбе і крапіве!

### *2. Хата*

Стаяла вугламі бацькоўская хата
На тых камянёх, што магутным накатам
Прынёс ледавік за сівымі часамі,
Да сонца гарнулася ціха вянцамі.
А зверху, вятрамі не раз шкамутаны,
На кроквах сядзеў капялюш саламяны.
Якое начынне вялося ў той хаце?
Спрадвечная печ, стол кульгавы, палаці
І куфар, якіх больш у вёсках не робяць,
Услончыкі, зэдлікі, розная дробязь.
Не мелася ў хаце драўлянай падлогі,
З зямлёй цалаваліся босыя ногі.
Дакладней, з пасцеленай цвёрдаю глінай,
Якую ўтрамбоўвалі пяты няспынна.
Галота, канешне, па погляд цвярозы...
Хоць быў і трысцен, дзе туліліся козы.
Калі маразы белы свет прыцісвалі,
То іх і курэй па настой забіралі.
Драмала ў засеках насеннае жыта,
Віселі: хамут, конскім потам наліты,
Каса і сярпы, вузлаватая пуга.
А кут быў заняты карміцелем-плугам.
Убогасць? Магчыма... Ды з іншага боку -
Няварта глядзець на былое звысоку.
Папраўдзе, не хата, а бедная хатка...
І ўсё ж ля загадкі блукае разгадка:
Як гэтая хатка не лепшай парою
Змагла ўзгадаваць змагароў і герояў,
Вучоных людзей, мастакоў і паэтаў,
Якіх раздарыла бязмежнаму свету?
Было, хоць нятлуста, але і не пуста:
Ля вечнае бульбы, гуркоў і капусты
Жыла тут сатканая Богам аснова -
Любоў да Айчыны і родная мова...
За тое, што доўжыцца існасці свята,
Паклон табе, беларуская хата!

### *3. Школа*

А школа то польскай, то рускай
Была пад праклятым прымусам.
Сваёй жа - на здзек - у прыкуску:
«Вучыцеся», беларусы...
Аднак для разумных і смелых
Сам гвалт стаў падказкаю,
Плюсам.
Дыктоўкі пасыл зразумелы -
Вучыцеся, беларусы.
У світцы, спавітаю путам,
Хлапчук сінявокі і русы
Засвоіў душою раскутай:
«Вучыцеся, беларусы»...
Двурушніцтва круціцца кола,
Люд змалку становіцца хлусам.
Вярнуць беларускую школу
Не хочуць дасюль беларусы.
Жыцця млын шчыруе завозна,
Млынар насміхаецца ў вусы...
Вучыцца ніколі не позна...
Вучыцеся, беларусы!

### *4. Настаўнік*

*Усе 10 год, як я настаўнічаў, я праводзіў беларускасць. Нават у клясе па матэматыцы чытаў беларускія вершы, каб захапіць вучняў.*
З успамінаў Барыса Кіта.

Любові радком пачынаецца ўрок,
А сонца ў ваконца
Загадкава свеціць.
Радок - быццам боскай мілосці
Глыток,
П'юць слова сваё
Беларускія дзеці.
Іх душы ўцякаюць ад пошасці зла,
Яны зелянеюць вясновай надзеяй
Прарвацца з цямрэчы сляпой
Да святла,

Якое прывабнаю доляй
Надзеліць.
Усё,
Што не сыдзе ніколі на спад,
Прыдасца ў варунках
Вялікай дарогі.
У вершах жыве
Матэматыкі лад,
Паэзія цепліцца ў формулах
Строгіх.
Каб пільным быў зрок
І настойлівым крок,
Каб роднасць не з'елі
Манкурцтва спакусы,
Любімы пастаўнік дае ім урок,
Урок найгалоўнейшы:
«Мы - беларусы!»
...Задыхана ў сёння
Вякі прыбрылі,
Але і дзяржаўнасць
Ратункам не стала.
Калі ж запануе на крэўнай зямлі
І ў долі,
І ў мове -
Высокая сталасць?
Да вусця імклівіцца першавыток,
Ды ўсё ў беларусаў дагэтуль
Няпроста...
(Акарыны радком пачынаецца ўрок,
А ў класе жыцця -
Гультаі, перарасткі...
І ўсё ж не згубіўся надзеі слядок.
Дзякуй, настаўнік, за родны радок!

***5. Persona non grata***

З губернскае Вільні прыйшла тэлеграма,
Паперка на словы была небагатай.
Чыноўніцкай моваю сказана прама:
«Pan Kita jest personą non grata».
Дазволу няма на паездку ў Еўропу -

І горка,
І крыўдна,
І ляснулі грошы...
Як трапіў у спіс,
То з жыццёвага тропу
Збіваць будзе доўга
Ізгойская ноша.
Але і пад гнётам чужынскае ўлады
Не стане свайго патрыёт
Іншаверцам.
Ёй марыць,
Што прыйдуць і воля,
І радасць,
Ён хоча застацца ў Радзімы
Пад сэрцам.
O, to białorusin!
Uparty, cholera!
Ні ў чым не налічыць сябе
Дзіўнаватым.
Вось толькі што выгналі chłopa
Праз дзверы,
А ён праз акно
Будзе ціснуцца ў хату...
Спіс чорны
Віжамі і зараз вядзецца,
Цкуюць за адданасць, за мову зацята.
Куды беларусу падацца, падзецца?
На роднай зямлі ён -
Persona non grata.

### *6. Астрогі*

Ён жыў беларусам,
А гэта якраз
Прычына нязменнай,
Нязбытнай трывогі...
Засовамі гвалту
Зноў бразгае час -
Уладам усім служаць верна
Астрогі.
За тое,

Што любіш свой край і народ,
Ты мусіш гібець
У скляпах недарэчных,
Дзе пах баланды
І парашы смурод
Над сэнсам жыцця
Насміхаюцца вечна,
Дзе прагне паныласць,
Каб позірк патух,
Дзе страх хоча годнасць
У пыл перацерці,
Дзе зло раз'ядноўвае
Цела і дух,
Каб іх паасобку давесці
Да смерці.
А там, за сцяною, -
Таксама турма,
Чужынцы забралі і неба, і поле.
І ўжо захлынаецца мова сама
Сухотным дыханнем
Абрыдлай нябволі.
Як свіст бізуна,
Над Айчынай гучыць:
«Psia Krew!»,
«Белорусское быдло!»
Ці «Schweine!»
Галосіць душа,
Быццам воўк уначы,
Бязмоўна, бясслёзна,
Ды горка, адчайна...
Цэнтраля ў Вялейцы
Апошняй была,
Людзей на той свет выпраўляла
Таропка.
Тут кожная хвіля бяздумна магла
Паставіць у лёсе
Свінцовую кропку.
Тут плавіўся час...
Зноў па скронях ён цёк...
І раптам...
Скразняк нечаканай свабоды...

Барыс ачуняў,
Хоць па сэрцы апёк
Застаўся нязводным таўром
Назаўсёды.
Але за працяг маладой дарогі
Падзяка і вам, забойцы-астрогі...

### *7. Першы*

Задача такая,
Што ў горле аж перхат...
Настаўнік абмервае позіркам спіс.
Каго выклікаць?
Хто ў вучобе найпершы?
«Do deski pójdzie Kita Borys...»
У свеце чужым жыць знянацку -
Не жарты,
Хтось іншы б зламаўся,
Душою закіс.
А ён лепіць лёс свой
Цярпліва і ўпарта —
«Ап die Tafel geht Kit Boris...»
Саўт-Рывэр,
Нью-Брапсвік
Засведчылі здатнасць:
Тулію землякоў,
Матэматыку грыз.
Вялі мазалі да «Apollo» і «Sbuttle»
«Come to the blackboard, Kit Boris...
Зямля пад напругай касмічнае цягі
Трымціць.
Трэба вызначыць курсу абрыс.
Яна выклікае без лішняй развагі:
«Да дошкі пойдзе Кіт Барыс!»
За смеласць,
Якая ўдачу вершыць,
Паклон пачынальнікам...
Слава першым!

## *8. Крылатая матэматыка*

*Усё жыцьцё я ставіў матэматыку*
*вышэй за палітыку.*
З успамінаў Барыса Кіта.

Сцяжына з Карэліч на Млечны Шлях
Выходзіць па формуле,
Лёсам разлічанай...
І ў тых невядомых,
Дзіўных краях
Матэматыка вышэй за палітыку.
Вякі -
Ступені ракеты жыцця,
Дзе веры і волі зліццё -
Маналітнае,
Дзе дум чаўнакамі тчэцца працяг, -
Матэматыка вышэй за палітыку.
Ад праўды святой чалавек пасталеў,
Ён існасць убачыў
Вачыма раскрытымі.
Быцця інтэграл - складаны,
Але
Матэматыка вышэй за палітыку.
Спачатку ў галовах -
Звадкі, разлад,
А потым абшары,
Крывёю залітыя...
Кінь позірк наперад ці зноў назад -
Матэматыка вышэй за палітыку.
На фонах каго толькі ні было!
На звалку змёў час недаваркаў
Без літасці.
А талент - жывучы...
Гонкім крылом
Матэматыка вышэй за палітыку.
Сам Бог пасабляе,
Водзіць руку.
На грыфелі космасу -
Лічбы і літары...
Ёсць сэнс глыбокі ў кароткім радку:
«Матэматыка вышэй за палітыку!»

Vivat, крылатая матэматыка!

### *9. Амерыка*

*Колькі талентаў зьвялося,*
*Колькі іх і дзе ляжыць*
*Невядомых, непрызнаных,*
*Не аплаканых нікім,*
*Толькі ў полі адспяваных*
*Ветру посьвістам пустым.*
Якуб Колас.

*У сцяну Капітолія замуравана «капсула часу»*
*з імем Барыса Кіта, якую ўскрыюць праз 500 гадоў.*
*Гэтым сімвалам ганаруюцца толькі людзі, якія*
*маюць асаблівыя заслугі перад Амерыкай.*
З друку ЗША

У свеце - на шчасце -
Ёсць той край,
Дзе можна лёсу кінуць пальчатку...
Яго ніяк ты не папракай,
Хоць трэба ўсё пачынаць
Спачатку.
У тым,
Што раптам стаў сіратой,
Што гвалтам выгнаны з роднай хаты,
Што крыўда тлее ў душы пустой, -
Няўжо Амерыка вінавата?
Яна прытуляе з даўніх дзён
Таго,
Хто мае і гарт,
І мэту.
Усіх плямён
Круты Вавілон
Бунтуе свет
Маладым імпэтам.
Не вырасце жыта
На жарсцве,
У ёй засыхае корань млявы.
Дзяржава талентамі жыве,
Яны ўраджаяць
Веліч і славу.

Сваіх, сваё ўзнімае яна
І беражэ,
Як ніхто,
Свабоду...
Ды ў сэрцах варожасці сцяна
Не рушыцца з кожным
Новым годам.
Не дачакацца пары,
Калі
Не сілы,
А праўды прыйдзе эра
На неспакойнай, пакутнай Зямлі...
Не прыйдзе...
А я чамусьці веру...
За тое, што ў беларуса паверыла,
Дзякуй табе, Амерыка!

### *10. Прапіска*

Чалавек хоча мець Айчыну і дом...
Толькі ёсць неаспрэчная ісціна -
Можна жыць на радзіме,
А быць бамжом,
Непрытульным, адлучаным лісцікам.
Праўда непераможна гучыць і ў тым,
Што ў выгнанні яшчэ раз народжаны
Беларус трудзіць сэрца сваім,
Святым...
І не знойдзеш мацнейшае роднасці!
Без любові шукацьме спакой
Дарма,
Будуць высі і дол непрыветнымі.
У Айчыне,
Што ёсць і якой няма,
Сцяты люд
Віртуальнымі метрамі.
Аддаляецца радасці гарызонт.
Незайздросная долечка ў лёкая -
Тут які ні ладзь еўрапейскі рамонт,
Не наблізіць ён
Шчасце далёкае.

Глянеш: кожная, кожны - ну проста цуд!
А як разам - такія прапашчыя...
Не ўцячы ад зняваг
І новых пакут
З беларусамі толькі па пашпарце.
Землякі п'юць
Пракіслай здрады віно.
На закуску - рукаў...
Нейкі кут - увечары...
А выгнаннік Вышэйшай Воляй даўно
Назаўсёды
Прапісаны ў Вечнасці.
За талент любіць па высокай мерцы
Дзякуй табе, беларускае сэрца!
II. Малады настрой
«А Ля-во-ні-ху Ля-вон па-лю-біў
Ля-во-ні-се ча-ра-віч-кі ку-піў...
Слова роснае
Смела вясна прывяла
З незабыўных абшараў
У Франкфурт-на-Майне.
Гэты дзень аж зіхціць
Ад красы і святла,
Сапраўды,
Нейкі ён трапяткі, незвычайны.
Кіт спявае,
Прытупвае хораша так,
І сустрэчай,
І сонцам лагодным сагрэты,
Што паверыш няўзнак -
На ўсе рукі мастак
Раскруціць можа ў танцы
Бабульку-планету.
Прад натхненнем жывым
Адступаюць гады.
Вунь і нейкая фраў
На яго паглядае...
А калі ў чалавека настрой -
Хоць куды,
А калі ў чалавека
Душа маладая!

Мабыць, нешта сваё
Вынес добры ўспамін,
Бо сагнаў, пратурыў маршчакі
Лоб высокі.
Акадэмік з хітрынкай
Зірнуў на жанчын,
І здаецца,
Што зараз ён кінецца ў скокі:
«Ля-во-ні-ха, ду-ша лас-ка-ва-я,
Ча-ра-віч-ка-мі па-ляс-ка-ва-ла..

## *12. Стоадсоткавы беларус*

*Ідуць народы зь лета ў лета*
*К жыцьцю, к сьвятлу зь бяды, з жуды,*
*А мы, як цені з таго сьвету,*
*Ідзём, ня знаючы куды.*
Янка Купала.

*«Мабыць, пад сто год стану*
*стоадсоткавым беларусам», -*
Барыс Кіт жартаўліва
прамаўляе да Васіля Быкава.

Міламу ўнуку наказваю кніжку -
Ясніцца ў позірках стрэчных
Блакіт...
Гэта аблічча знаёма Францішку,
Сведчыць з пашанай:
«Дзядулецька Кіт!»
Верыцца,
Што супадаюць дарогі
Двух дарагіх,
Родных сэрцу людзей.
Хоць мне ніяк
Не пазбыцца трывогі -
Мала падстаў
Для вялікіх падзей...
Шлях да святла
Прабівае планета,
Нішчыць няпраўду паўсюль
Жыццятрус.
Толькі ў тутэйшых згубілася мэта -

Бульбу капае бядак-беларус.
Зноў ён загнаны на зрэбныя соткі,
З іх да свабоды яму не дапяць.
Праўда - далёка...
А голад - не цётка.
Трэба згінацца...
І трэба капаць.
Не пра бабульку кажу,
Што, як шчасце,
Пенсію rорnе да сэрца ў сяле
І ў падарунак сталічным нашчадкам
Радыяцыйную бульбачку шле.
І не пра тых,
Хто да ўлады дарвацца
Змог на хлусні
І гвалтуе цяпер,
Хто з нор запоўз
У катэджы, палацы,
Дзе плодзіць невукаў і ненажэр.
Хто за падачку
З рукі круцяверця
Згодны і Богу,
І чорту маніць,
Хто спадцішка
«Эскадронамі смерці»
Прагне імкненне
Да волі спыніць...
Сорамна мне
За мільёны свядомых,
Быццам і здатных,
А духам слабых.
Многія маюць на пары дыпломаў,
Ды на паверку -
Сляпыя рабы.
Страх,
Самаедства ў здрабнелым народзе.
Зараз адвагу дзе хочаш вазьмі...
Муліцца,
Колецца,
А не выходзіць
Мецць гожы Дом,

Быць з усімі людзьмі...
Ён жа ідзе па жыцці
Горда, смела
І здабывае нябёсаў мілосць.
Вучыць любіць
Продкаў скарб ацалелы,
Помніць,
Што зоркі над доляю ёсць.
Лёсам,
Дзе радасць і боль
Шчодрай мерай,
Тым,
Што адкінуў забітасці груз,
Кліча да годнасці ўсіх,
Хто не верыць,
Кіт -
Стоадсоткавы наш Беларус.
Дзякуй, Настаўнік!
Жыве Беларусь!

© OCR: Камунікат.org, 2013
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2013
© PDF: Камунікат.org, 2013

## Кнігі Сяргея Законнікава

1. «Бяседа» (вершы), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1973.
2. «Устань да сонца» (вершы і паэма), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1976.
3. «Пакуль жыве мая бяроза» (вершы і паэма), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1981.
4. «Вера, надзея, любоў» (кніга лірыкі), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1983.
5. «Встань раньше солнца» (стихи), Москва, «Советский писатель», 1985.
6. «Прысак часу» (вершы, паэмы), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1986.
7. «Сутнасць» (кніга паэзіі), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1987.
8. «Вечная далеч» (вершы), Мінск, «Юнацтва», 1987.
9. «Заклінанне» (кніга паэзіі), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1991.
Ю. «Святая воля» (выбраная лірыка), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1993.
11. «Беларускае сэрца» (эсэ, публіцыстыка), Мінск, «Беларусь», 1993.
12. «Вячэра пад райскім дрэвам» (эсэ, нарысы), Мінск, «Мастацкая літаратура», 1996.
13. «Czarny koń Apokalipsy» (poemat), Warszawa, «Pod wiatr», 1996, 2006 (перавыданне).
14. «Лістам дарога запала...» (выбранае), Мінск, «Мастацкая літаратура», 2000.
15. «Пътят на душата» (стихотворения и поеми), София, «Славяни», 2002.
16. «Гэта мы» (паэмы), Вяленка, Спартова-патрыятычная ініцыятыва «Волат», 2006.
17. «Першы пацалунак» (сто вершаў пра каханым;), Мінск, «Кнігазбор», 2007.
18. «Дол» (вершы і паэмы), Мінск, «Галіяфы», 2008.
19. «Насустрач» (публіцыстыка, эсэ), Мінск, выдавец Зміцер Колас, 2008.

## Біяграфічная даведка

Сяргей Законнікаў нарадзіўся 16 верасня 1946 года ў вёсцы Слабада Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Глыбачанскую СПІ Ушацкага раёна (1964), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1969).

Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, завучам Клетнаўскай СІП Барысаўскага раёна, карэспандэнтам ушацкай раённай газеты «Патрыёт», другім сакратаром Ушацкага РК ЛКСМБ, загадчыкам аддзела сельскай моладзі газеты «Чырвоная змена», карэспандэнтам аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда», загадчыкам сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ. На працягу амаль 16 гадоў быў галоўным рэдактарам часопіса «Полымя» (1986 - 2002).

Аўтар многіх кніг паэзіі, эсэ, публіцыстыкі, нарысаў. Асобныя выданні выходзілі ў Маскве, Варшаве, Сафіі (у перакладзе). Яго вершы перакладзены таксама на ўкраінскую, нямецкую, літоўскую, англійскую, грузінскую, іспанскую, сербскую, харвацкую, венгерскую, в'етнамскую і іншыя мовы свету. С. Законнікаў пераклаў на беларускую мову творы паэтаў Украіны, Польшчы, Германіі, Балгарыі, Літвы.

Сяргей Законнікаў - лаўрэат літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова за кнігу паэзіі «Пакуль жыве мая бяроза» (1982), Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы за кнігу паэзіі «Заклінанне» (1992), міжнародных літаратурных прэмій: Польшчы імя Вітольда Гулевіча - за кнігу паэм «Чорны конь Апакаліпсісу» (1996), Украіны імяРыгора Скаварады - за цыкл вершаў «Жыві, Украіна!» і перакладчыцкую дзейнасць (1997), прэміі таварыства «Беларуска-нямецкія сустрэчы» імя Барыса Кіта за заслугі ў развіцці беларускай літаратуры і ў адраджэнні духоўнасці (2005). Узнагароджаны медалём «За выратаванне тапельцаў на водах» (1960), ордэнам «Знак пашаны» (1984), ордэнам Украіны «За заслугі» III ступені (2006).

**Змест**

Мне свет цікавы
«Давай палятаем!»
***Ёсць раўнавага ў спрадвечнай прыродзе
***Пабольшаў дзень на вераб'іны крок
Еду з кірмашу
Аркестр
***Жыццё - не карнавал
Занятак
Скляпенне віны
Адыходзіць эпоха
На аўтобусным прыпынку
Белая сукеначка
Цяжэй
Я хворы табой
Глядзець у неба
Усё было
Умова
Мацней даражу
Пальчык
Першы пацалунак
Дол
Застацца дома
Крутыя дні
Косы
***Я ж твае ножкі не памарожу
Імёны
Паядынак
Паштоўка Ніне Мацяш
Недзе грыміць
Я ўжо там
Мясцовы маршрут
Вялікая дзяльба
Дзе я?
Эцюд
Адкуль?
Чарада
Трымайся!
Падноўленае retro
«Стабільнасць»
Чатыры гады
Надзея
Разам і асобна
Непальскі хлопчык

Лікі
Шэрыя сцены
Двое
Каханне - гэта свабода
Рамяство
Страўнік
Знікаюць людзі
Раны
Бяроза над Свіцяззю
Прывал
Цёмны горад бі
Беларускі палігон
Ні слова!
Устаньце!
Дождж са снегам
Вёска Святая Воля
Лёгкі хлеб
Мая сасна
Ваяводзінская альтанка
Ляйпцыгскі трамвай
Праклятыя пытанні
РБ
***Зманны міг, мімалётнае дзіва
Люблю Украіну
Віртуальны пагост
Ля помніка Джорджу Вашынгтону
Зялёная свабода
Берлінская сцяна
Кроплі
Цана слова
Шалёная Куля
Per aspcra ad astra (паэма)
Кнігі Сяргея Законнікава
Біяграфічная даведка

*Літаратурна-мастацкае выданне*
Законнікаў Сяргей Іванавіч
Шалёная куля
Вершы пяці гадоў
Дызайн вокладкі *А. Сычоў*
Рэдактар *Л. Законнікава*
Адказны за выпуск *Зм. Колас*
Падпісана да друку 25.11.2010. Фармат 84х90 11у
Папера офісная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 3,40. Ум. друк. арк. 4,55.
Наклад 500 асобнікаў.
Выдавец і паліграфічнае выкананне:
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас
ЛИ № 02330/0552654 ад 14.01.2010.
пр. Незалежнасці, 105-14,220023, Мінск.